# Невядомы, але не забыты

**Памяць пра людзей, якія аддалі жыццё за наша мірнае неба, павінна быць вечнай.**

Даніну памяці невядомаму салдату, які загінуу пад вёскай Камары Ноукінскага сельсавета у часы Вялікай айчыннай вайны, аддалі актывісты прафсаюзнага руху работнікау адукацыі і навукі Першамайскага раёна. Старшыня Ноукінскага сельвыканкама і вайскоуцы унутраных войскау воінсай часці № 5524. Іх агульными намаганнямі напярэдадні Дня Перамогі быу устаноулены новы помнік безыменнаму герою з сімвалічным надпісам: «Імя твaё невядома, подзвіг твой не забыты».

Як паведаміу старшыня Ноукінскага сельвыканкама Аляксандр Красакоу, магіла была знойдзена юнымі следапытамі Камароусай школы у 1988 годзе. Пра лёс салдата, які загінуу на гэтай зямлі, пакуль ніякіх звеста не знайшлі. Невядома не толькі яго імя, але і час смерці. Магчыма, гэта было пры наступленні гітлераускіх войскау ці у больш позні час, пры вызваленні краю ад захопнікау.

Грашовыя сродкі на добраупарадкаванне старой магілы былі пералічаны прафсаюзнымі пярвічкамі устаноу адукацыі і навукі Першамайскага раёна. З удзелам педагогау, вайскоуцай і прадстаунікоу мясцовай улады адзінокая магілка у полі полі ля дарогі набыла больш прадстаунічы, даглежданы выгляд. Вакол помніка пасаджаны кветкі і устаноулена агароджа.

Са словамі удзячнасці да калег і усіх, кто прыняу удзел у добраупарадкаванні магілы і ушаванні памяці абаронцы Віцебшчыны, звярнууся старшыня прафсаюза работнікау адукацыі і навукі Першамайскага раёна Сяргей Нікіцін.

Закончылася акцыя ушавання памяці салдаты святочным мітынгам.



**Андрэй Захарау**
**Газета «Витьбичи»**
**от 24.05.2014 года.**